ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 103 (1070) | ПАНЯДЗЕЛАК, 5-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2 кап.

## 11-га МАЯ 5-ты ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

**Усім членам і кандыдатам ЦК і цэнтральнай рэвізійнай камісіі ЛКСМБ**

11 мая г. г. склікаецца 5-ты пленум ЦК ЛКСМБ з наступным парадкам дню:

1) Даклад бюро ЦК ЛКСМБ аб выкананьні дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ (Дакл. тав. Палякоў).

2) Даклад аб падрыхтоўцы кадраў і задачах ЛКСМБ (Дакл. т. т. старшыня Дзяржпляну Гольдберг і Шоламаў),

3) Аб вайскова-фізкультурнай рабоце (Дакл. т. т. Ільлічаў і Леў).

4) Аб перавыбарах бюро ячэек і комітэтаў ЛКСМБ (Дакл. тав. Рындзіч).

Сэкратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

# 5-га МАЯ—ДЗЕНЬ БАЯВОГА АГЛЯДУ ПРОЛЕТАРСКАГА ДРУКУ

**„Друк—адзіная прылада, пры дапамозе якой партыя кожны дзень, кожную гадзіну гаворыць з рабочай клясай на сваёй, патрэбнай ёй мове“ (СТАЛІН)**

# ДРУК, ЯК ОРГАНІЗАТАР МАС

Дзень друку—дзень генэральнага агляду і самаправеркі ўсёй работы партыйна-савецкага друку. Ва ўмовах рэконструкцыйнага пэрыоду, у абставінах жорсткага клясавага змаганьня ў вёсцы, пры неабходнасьці ў радох самой партыі завастрыць змаганьне на два фронты і супроць прымірэнцтва да ўхілаў,—друк набывае выключнае значэньне.

„Друк—адзіная прылада, пры дапамозе якое партыя кожны дзень, кожную гадзіну гаворыць з рабочай клясай на сваёй, патрэбнай ёй мове. Іншых сродкаў працягнуць духоўныя ніткі паміж партыяй і клясай, другога такога гібкага апарату ў прыродзе ня існуе“. (Сталін).

Самаправерка друку—ня толькі ў дзень друку, але кожны дзень,—павінна завастрыць і зрабіць больш дзейнай гэту важнейшую прыладу комуністычнай партыі і рабочае клясы ў змаганьні за социялізм.

Комуністычны друк і партыя—адно непарыўнае цэлае. Гісторыя нашага друку неадлучна ад гісторыі большавізму і пролетарскай рэволюцыі.

Калі бальшавіцкая організацыя ў падпольлі ставіла перад сабою задачу —„заваяваньне політычнай улады пролетарыятам і організацыю социялістычнага грамадзтва“ (Ленін „Наша програма“), дык агітатарам, пропагандыстым і організатарам мас вакол партыі для ажыцьцяўленьні гэтых задач быў падпольны бальшавіцкі друк. Ад ленінскай „Іскры“ і падпольных лістоў і адозваў, ад першага легальнага бальшавіцкага друку ў рэволюцыі 1905-6 г.г., мінаючы гады зрочнай рэакцыі і экономічнай дэпрэсіі, наша партыя на грэбені хвалі рэволюцыйнага рабочага руху ў 1912 годзе падыйшла да штодзённай бальшавіцкай рабочай газэты.

5-га мая (22 красавіка) 1912 году, вядомая веха ў гісторыі рабочага руху. На сабраныя самімі рабочымі сродкі была організована „Правда“.

Да дзесяцігадовага юбілею „Правды“ 5 мая, у 1922 годзе Ленін пісаў: „Калі закладалася старая „Іскра“, у 1900 годзе, у гэтым удзельнічаў які небудзь дзесятак рэволюцыянэраў. Калі ўзьнікаў бальшвізм, у гэтым удзельнічала на нелегальных зьездах Брусэлю і Лёндану ў 1903 годзе дзесяткі чатыры рэволюцыянэраў.

У 1912-13г.г., калі ўзьнікала легальная бальшавіцкая „Правда“ за ёю стаялі дзесяткі і сотні тысяч рабочых, якія сваімі капеечнымі зборамі перамаглі і ўціск царызму, і конкурэнцыю дробна-буржуазных здраднікаў социялізму—меншавікоў“.... а ў змаганьні бальшавікоў была ў канны кастрычніка і ў лістападзе 1917 г. большасьць пролетарыяту і сьвядомага сялянства.

Праз „Правду“ партыя, сама знаходзячыся ў падпольлі, наладжвала сувязь з шырокімі пластамі рэволюцыйных рабочых. „Правда“ з першых дзён свайго існаваньня зрабілася службовым органам партыі, організатарам —у цяжкіх умовах царызму—рабочых мас вакол няўрэзаных лёзунгаў бальшавізму. Нават такая „нявінная“ з першага погляду справа, як збор сродкаў у жалезны фонд „Правды“ па сутнасьці была важнейшай партыйнай справай, на аснове якое організовалася не адна партыйная група рабочых і за што не адна сотня рэволюцыйных рабочых трапіла у турмы і ссылку. Праз „Правду“ рабочыя шчыльна падыходзілі да партыі!

У працягу больш двух год, з неабаразовымі перапынкамі, выклікаными жандарскімі рэпрэсіямі, „Правда“ пад рознымі назвамі („Рабочая Правда“, „Северная Правда“, „За правду“, „Путь правды“ і г. д.), кіраваная Леніным з-за мяжы, рабіла сваю вялікую справу—выхавала і пропагандавала ідэі бальшавізму і організоўвала шырокія рабочыя масы вакол партыі.

Праз два гады пасьля зараджэньня „Правды“ (5 мая (22 красавіка) 1914 году) піцерскія рабочыя організавалі першы дзень рабочага друку для збору сродкаў і пропаганды ідэй „Правды“ сярод шырокіх мас рабочых. „З маленькіх лічбаў“, збораў на „Праўду“, Ленін рабіў вялікія вывады аб тым, за кім—за бальшавікамі ці меншавікамі—ідуць рабочыя масы.

Дзень рабочага друку, ня гледзячы на ўсе змаганьні ахранкі і жандармэрыі, разгарнуўся ў шырокую, масавую і працяжную кампанію за бальшавіцкую легальную прэсу, за далейшае скарыстаньне яе ў якасьці прываднога пасу для сувязі падпольнай бальшавіцкай партыі з рабочымі масамі.

Сусьветная імпэрыялістычная бойня на час перарвала існаваньне штодзённай бальшавіцкай легальнай прэсы. Царская жандармэрыя задушыла „Правду“ і арыштавала работнікаў партыі.

Пасьля першых-жа дзён лютаўскай рэволюцыі зноў адраджаецца „Правда“ ўжо адкрыта, як орган Цэнтральнага Камітэту партыі бальшавікоў. Праз „Правду“ на ўсю Расію грымеў рэволюцыйны заклік Леніна да рабочых „Уся улада советам“. „Правда“ зрабілася баявым і організуючым цэнтрам нарастаючай пролетарскай рэволюцыі.

Часовы ўрад праз юнкераў дарэмна прабаваў задушыць бальшавіцкі друк. Нават разгром 18 (5) ліпеня 1917 г. друкарні „Правда“ не дапамог буржуазіі ўмацаваць свае позыцыі ў змаганьні супроць бальшавізму.

Зноў, як і за царызмам, пад рознымі назвамі („Листок Правды“, „Рабочий и Солдат“, „Рабочий Путь“ і інш.) цэнтральны орган партыі, побач з іншым бальшавіцкім друкам у Маскве і на франтох, працягваў, пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна, выконваць сваю гістарычную справу—організацыю і падрыхтоўку мас да захвату ўлады і ўстанаўленьня пролетарскай дыктатуры.

Наступіўшыя сьледам за тым цяжкія гады грамадзянскай вайны былі гадамі выключнага гэроізму і напружанай работы для нашага друку. Ён дапамагаў партыі, ва ўмовах разрухі, організаваць перамогу на франтох грамадзянскай вайны.

У далейшым—у змаганьні за транспарт, за вугаль, нафту і руду пролетарская рэволюцыя, праз адбудоўчы пэрыод нашае народнае гаспадаркі, падыйшла шчыльна да рэконструкцыйнага пэрыоду, да разгорнутага будаўніцтва социялізму.

Задачы друку значна ўскладніліся. Нашы газэты павінны былі перабудавацца ў органы вытворчага выхаваньня, у прыладу социялістычнага будаўніцтва. Яшчэ Ленін з усёй яму уласьцівай выразнасьцю і яснасьцю вызначыў гэты шлях разьвіцьця партыйнага савецкага друку. У сваім артыкуле „Коммунистическая печать в переходном периоде“, ён піша:

„Менш політычнай траскатні, менш агульных разважаньняў і абстрактных лёзунгаў, якімі захапляюцца няспрактыкаваныя і незразумеўшыя сваіх задач комуністыя, — больш вытворчай пропаганды, а больш за ўсё дзелавога, умелага прыстасаваньня да ўзроўню разьвіцьця масы, уліку практычнага вопыту“ (Ленін, т. XУIII, ч. 1, стар. 78).

Гіганцкі размах капітальнага будаўніцтва ў нашай прамысловасьці, задачы социялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, мобілізацыя і організацыя мас вакол чарговых задач партыі і рабочае клясы, у змаганьні за прамфінпляны, за разгорнутае колгаснае будаўніцтва, мяркуе выключнае напружаньне ўсіх сіл партыйных, профэсыянальных, комсамольскіх і гаспадарчых організацый, у тым ліку ўсяго нашага друку. Выкананьне пяцігодкі, як папярэдняя ўмова ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі „дагнаць і перагнаць у тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны“, у сваю чаргу патрабуюць карэннай перабудовы радоў і мэтадаў работы партыйна-савецкага друку, які абавязан усвоіць і ператварыць у сваёй рабоце тыя паскораныя тэмпы, якімі зараз жыве і працуе ўвесь савецкі край.

За апошні год значна выраўнялася лінія нашых газэт. Значна бліжэй, чым раней, рабочы друк падыйшоў да жыцьця фабрыкі і заводу, паасобнага цэху і майстэрні. Але поўнасьцю разрыў паміж бурным тэмпам будаўніцтва социялізму ў нашай краіне і пропагандысцка-організацыйнай работай партыйнага і інш. друку яшчэ не ліквідаваны.

„Друк як цэнтральны, так і мясцовы, які зьяўляецца мацнейшай зброяй у руках пролетарскае дзяржавы, ня выконвае, як правіла, задачы канкрэтнага асьвятленьня дасягненьняў і недахопаў... ня выконвае задачы мобілізацыі намаганьняў партыі і пролетарыяту на ліквідацыю недахопаў у рабоце гаспадарчых, профэсыянальных і партыйных організацый“ (З адозвы ЦК партыі ад 25 студзеня г. г.).

У асьвятленьні практыкі і тэорыі колгаснага будаўніцтва, ва ўмелым і правільным растлумачэньні і правядзеньні генэральнай лініі партыі, у змаганьні з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай і антысераднядзкімі „левымі“ заскокамі і перагібамі, некаторыя газэты за апошнія месяцы мелі рад сур'ёзнейшых правалаў. Сваю ролю організатара мас і сыгналізатара прарываў на паасобных вучастках социялістычнай будоўлі наш друк, асабліва мясцовы сялянскі, ня выканаў з выстарчальнай выразнасьцю і яснасьцю.

У дзень генэральнай праверкі друку аб рабоце тэй або іншай газэты трэба меркаваць на падставе таго, як газэта дапамагла выканаць прамфінплян паасобнага прадпрыемства, данага заводу або фабрыкі, як газэта дапамагла ў організацыі веснавой сяўбы, як газэта праводзіць агляд унутры-колгаснай работы па замацаваньні дасягнутых вынікаў у колгасным будаўніцтве, як газэта на справе, а ня толькі на словах ажыцьцяўляла дырэктывы і праводзіла генэральную лінію партыі.

У дзень друку трэба праверыць, як ва умовах конкрэтнай рэчаіснасьці мясцовыя газэты навучыліся, ня змазваючы, не затушоўваючы канчатковай мэты партыі, ухапіцца за асноўнае на даным этапе зьвяно.

Пры дапамозе бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, але не дапускаючы перахлістваньні і скарыстаньні лёзунгу самакрытыкі ў мэтах антыпартыйных, антысавецкіх, газэты абавязаны ў значна большай ступені, чым да гэтага часу, мобілізаваць намаганьні рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас на хутчэйшае перамаганьне трудпасьцяй росту, на правільнае ажыцьцяўленьне ў конкрэтнай абстаноўцы генэральнай лініі партыі.

Такая работа друку вызначае яе барацьбу на два фронты, супроць адстаючых і супроць забягаючых наперад, а таксама супроць усякага прымірэнцтва да ўхілаў.

На даным этапе перад нашым друкам ва ўвесь рост паўстала задача—ўмацаваць свае сувязі з рабочымі масамі, праз масавыя аддзелы газэт і шляхам узмацненьня рабселькораўскага руху. Комуністычная прэса —колектыўны агітатар, колектыўны пропагандысты і ў асаблівасьці колектыўны організатар мас. Яшчэ да першай рэволюцыі 1905 году Ленін у лісьце „Для Барыса“ пісаў: „Орган будзе жывым і жыцьцёвым толькі тады, калі на пяцёх кіруючых і пастаянна пішучых літаратараў прыпадзе пяцьсот і пяць тысяч работнікаў нелітаратараў“. Зараз партыйны друк мае сотні тысяч рабселькораў. Але ў поўнай меры наша прэса органамі колектыўнае творчасьці рабочых мас яшчэ ня стала. Лёзунг партыі і профсаюзаў „тварам да вытворчасьці“ патрабуе рашучага палепшаньня масавай работы і ўцягненьня новых кадраў рабочага актыву ў штодзённую практычную работу газэт.

Партыйная нарада па пытаньнях асьветы завастрыла ўвагу ўсёй савецкай грамадзкасьці на чарговых задачах культурнай рэволюцыі. Нецярпіма значнае адставаньне тэмпаў культурнага будаўніцтва ад паскораных тэмпаў гаспадарчай рэконструкцыі краіны. Тав. Молатаў на XV зьезьдзе сказаў: „Чаго не хапае нам у сучасны момант у вёсцы, асабліва ў сувязі з новымі задачамі? Культуры, яшчэ і яшчэ раз культуры. Літаральна ўсё ў сучасны момант упіраецца ў вёсцы ў недахват культуры. Да любой галіны падыйдзеце: наша някультурнасьць, адсталасьць, а часамі проста дзікасьць не даюць нам разгарнуць тое новае, што ёсьць у вёсцы“.

Гэтыя словы т. Молатава да гэтага часу захавалі сваю актуальнасьць. З усёй бальшавіцкай настойлівасьцю прэса абавязана дапамагчы партыі ў хутчэйшы тэрмін дабіцца рашучага выраўненьня культурнага фронту, асабліва ў вёсцы.

У дзень друку праверым, наколькі нашы газэты за мінулы пэрыод на справе ажыцьцявілі ленінскі завет: „Больш увагі таму, як рабочая і сялянская маса на справе будуюць нешта новае, новае ў сваёй штодзённай рабоце. Больш правёрні таго, наколькі комуністычна гэта новае“. („П.К.“)

# МІЖНАРОДНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ У ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ ПАД КОМУНІСТЫЧНЫМІ СЬЦЯГАМІ ДЭМОНСТРАВАЎ СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА БАРАЦЬБЫ З КАПІТАЛАМ

## За комунізм

СТОКГОЛЬМ 2.—У першамайскай дэмонстрацыі ў Стокгольму компартыя вывела на дэмонстрацыю звыш 2.000 чалавек. Рабочыя дэмонстравалі пад лёзунгамі: «За камунізм», „за Савецкі Саюз“. У Дэсэнборэе дэмонстравала пад сьцягамі компартыі звыш 4.000 рабочых. Дэмонстрацыя падпарадкавалася нападу поліцыі. У Лулеа ў комуністычнай дэмонстрацыі ўдзельнічала 3.000 рабочых, у Мальмемгрэце—1.600 і ў Гобдэне—1.000. У Лансбро ў дзень 1 мая ўгворана новая організацыя компартыі.


## Большасьць фабрык і заводаў спынілі працу

ШАНХАЙ, 1.—Ня гледзячы на рэпрэсіі і нядобрае даждлівае надвор'е, у розных частках гораду адбываліся дэмонстрацыі. На адной дэмонстрацыі узьвіўся савецкі сьцяг. Усе дэмонстрацыі разагнаны поліцыяй, якая ўтварыла шмат арыштаў. Большасьць фабрык і заводаў спынілі сёньня работу. Горад літаральна ператвораны ва ўзброены лягер. Паўсюды растаўлены атрады поліцыі, узброенай рэвальвэрамі. Прадпрыемствы, дзе абвешчана забастоўка, узмоцнена абараняюцца.

## „Прэч „рабочы“ урад голаду“

ЛЁНДАН, 1. Дэмонстрацыя на чале з членамі ЦК компартыі Англіі ўвайшла ў Гайд-Парк. Па ўсім шляху дэмонстрацыі раздаваліся лёзунгі: „Далоў Макдональда“, „рабочы ўрад голаду“, „Няхай жыве Савецкая бацькаўшчына“. Агульны лік дэманстрантаў дасягаў 10.000. У Гайд-Парку да дэманстрантаў далучыліся вялікія масы рабочых, сярод якіх выступалі комуністычныя прамоўцы. Сабралося ня менш 20 тысяч чалавек.

## Агляд баявых сіл



21-га сакавіка адбыўся ў Лейпцыгу ўсенямецкі дзень рабочай моладзі, організаваны нямецкім комсамолам. Звыш 100000 маладых рабочых дэманстравалі сваю адданасьць рэволюцыі і гатоўнасьць змагацца за нізрынуцьцё буржуазнага панства.

Поліцыя, кіруемая левымі социял-дэмакратамі, імкнулася справакаваць крывавую баню, але яе спробы разьбіліся аб рэволюцыйную дысцыплінаванасьць рабочай моладзі.

НА ЗДЫМКУ: Выступленьне тав. Тэльмана

# ПРАЦАВАЦЬ БАЛЬШАВІЦКІМ ТЭМПАМ ДА СКАНЧЭНЬНЯ ПАЛЯВЫХ РАБО

**Колгасы імя „Чырвонай Зьмены“ і „16-ці партызан“ скончылі вясеньнюю сяўбу.**

**Аднак, па шэрагу колгасаў назіраецца паслабленьне ўвагі да тэмпаў сканчэньня вясеньняй сяўбы**

> „БЛІЖЭЙШАЯ ПРАКТЫЧНАЯ ЗАДАЧА КОЛГАСУ МЕСЬЦІЦЦА У БАРАЦЬБЕ ЗА СЯЎБУ, У БАРАЦЬБЕ ЗА НАЙБОЛЬШАЕ ПАШЫРЭНЬНЕ ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ, У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАВІЛЬНУЮ ОРГАНІЗАЦЫЮ СЕВУ„ („Адказы таварышам колгасьнікам“. СТАЛІН).

## Колгас „Чырвоная Зьмена“--ўдарны


Пасеўная кампанія па шэрагу колгасаў Сьмілавіцкага раёну ўжо чадыходзіць да канца. Калгасы ор-ганізоўваюць дапамогу адзін аднаму, каб хутчэй скончыць сяўбу, паказаўшы індывідуальным гаспадаркам сваю сілу і організаванасьць.

Колгас „Чырвоная Зьмена“ абвясьціў сябе ўдарным на выкананьне плянаў сяўбы з перавышкай, выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва колгас „Вясёлае Жыцьцё“ (Судзінскага сельсавету). Колгас „Чырвоная Зьмена“ амаль скончыў засеў усіх яравых культур. Колгасьнікі, разгортваючы паміж сабой спаборніцтва, заахвочвалі адзін аднаго хутчэй выканаць плян вясеньняй пасеўнай кампаніі ў сваім колгасе з тым, каб дапамагчы суседняму менш моцнаму колгасу „Чырвоны Сьцяг“.

У часе сьвяткаваньня вялікадню колгасьнікі „Чырвонай Зьмены“ організавалі выезд на дапамогу ў працы колгасу „Чырвоны Сьцяг“. Аб'яднаўшыся, два колгасы прарабілі вялікую працу і паскорылі ворыва і засеў яравых культур.

„Чырвоназьменцы“ першыя ў Сьмілавіцкім раёне дапамаглі менш моцным колгасам скончыць сяўбу. Патрэбна ўсім астатнім больш моцным колгасам узяць прыклад з „Чырвонай Зьмены“.

**Росьсявец.**



Трактарная калёна на калгаскіх палёх.

## Ліквідаваць пагрозу зрыву

*Балгас „Надзея“ Буда-Кашалеўскага раёну скончыў раньні пасеў збожжавых і травяных культур і часткова падрыхтаваў глебу для заворкі пазьнейшых яравых культур.*

*Але за апошні час адчуваецца адсутнасьць ў працы таго ўздыму і організаванасьці які быў у пачатку разгортваньня вясеньняй пасеўнай кампаніі. Адчуваецца маруднасьць і слабасьць належнай працоўнай дысцыпліны. Ёсьць выпадкі, калі асобныя калгасьнікі ня выходзяць на працу, ня добра выконваюць яе, і ў выніку—к засеву позьніх культур падрыхтавана толькі каля паловы глебы, прадугледжанай па пляну.*

*Такое становішча працоўнай дысцыпліны за апошні час складае пагрозу зрыву выкананьня плянаў і організаванага сканчэньня вясеньняй сяўбы.*

*У колгасе яшчэ да гэтага часу не разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцкі рух.*

*Комсамольская ячэйка і савет колгасу павінны ўлічыць пагрозу зрыву выкананьня пляну сяўбы і зараз-жа кінуць усе сілы на організаванае сканчэньне сяўбы.* **Крок.**



УДАРНІЦА ЗА ПРАЦАЙ

## Колгасы „Чырвоная Зьмена“ і „16-ці Партызан“ скончылі сяўбу

**Колгасы Дукорскага сельсавету (Менскай акругі) «Чырвоная Зьмена», „16-ці Партызан“ скончылі пасеў усіх яравых культур. Плянавыя наметкі па шэрагу культур перавыш... Заданьне ўраду аб пашырэньні пасеўнай плошчы колга... таксама выканана.**

**Г. ФРЫ...**

## Вазьмеце прыклад з Смалявіцкіх комсамольцаў

Праца па праводзеньню вясеньняга севу выявіла ў паасобных колгасах Смалявіцкага сельсавету нехадоп працоўнай сілы, што пагражае своечасоваму сканчэньню сяўбы.

Комсамольская ячэйка Смалявіцкай школы сямігодкі, абгаварыўшы гэта пытаньне, узяла шэфства над колгасамі: „Прогрэс“, „Чырвоная Ніва“ і «Колас» па дапамозе ім працоўнай сілай.

Організаваўшы ўдарныя брыгады з комсамольцаў і вучняў ячэйка ўжо практычна прыступіла да працы. Брыгады дапамаглі пасеяць раньнюю бульбу і скончыць ворыва ўсяго колгаснага поля.

Брыгады разьлічылі правесьці сваю працу ў колгасах з 25 красавіка па 25 мая. За гэты перыод брыгады маюць мэту ня толькі дапамагчы колгасам скончыць вясеньнюю сяўбу, але і паладзіць вучот і організацыю ўнутранае працы ў колгасе, дапамагчы організаваць соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарныя брыгады.

Побач з гэтым, у дні адпачынку комсамольцы і вучні школы праводзяць у колгасе працу па ...джваньню культурна-масавага абслугоўваньня колгасьнікаў.

Комсамольская ячэйка і ... Смалявіцкай беларускай 7-гадовай школы выклікаюць пасьледваць ... няму прыкладу Сьмілавіцкую і ...скую № 2 беларускія сямігодкі.

**Мікалевіч і Сабалеўскі**

## У баку ад політычных задач

Фрунзэўскі райком ЛКСМБ падцьвердзіў пастанову парт'ячэйкі агульнага сходу комсамольскага колектыву Белпэдтэхнікуму аб ...пуску бюро колектыву. Бюро ня справілася з сваімі задачамі. Сакратар ячэйкі ЛКСМБ Ляшкевіч пакінула работу бяз ніякіх уважлівых прычын, сход патрабаваў выключэньня тав. Ляшкевіч з комсамолу.

Зараз пачалася чыстка комсамольцаў-выпускнікоў. Падрыхтаванасьць да чысткі нявыстарчальная, на чыстцы пагляд... ...насьць, нежаданьне крытыкаваць свайго таварыша. Правяркомам ...яўлена, што ў ячэйцы панаваў заціск самакрытыкі з боку некаторых членаў бюро (Кузьміцкі, Пашучэнка). Няма кіраўніцтва піонэрат...дамі, соцспаборніцтва ганебна правалена. Ячэйка стаіць у баку ад політычных кампаній.

Чыстка павінна аздаравіць комсамольскі колектыў Белпэдтэхнікуму. Колектыў павінен стаць баяздольным у грамадзкім і вытворчым жыцьці тэхнікуму.

**Хомчанка**

## Інформацыйнае паведамленьне

28 і 29 красавіка адбыўся пленум Менскага АК ЛКСМБ.

Пленум заслухаў інформацыю сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Паляхова аб рашэньнях ЦК ЛКСМБ і Менскага АК КП(б)Б аб аслабаненьні тав. Маслоўскага ад абавязкаў сакратара Мен. АК ЛКСМБ і аб водкліку яго ў распараджэньне АК КП(б)Б.

Пленум згадзіўся з рашэньнямі ЦК ЛКСМБ і АК КП(б)Б і аслабаніў тав. Маслоўскага ад абавязкаў сакратара АК.

Сакратаром МенАК ЛКСМБ пленум аднагалосна абраў тав. Гайдукевіча, аслабаніўшы яго ад абавязкаў загадчыка організацыйна-інструктарскага аддзелу.

Загадчыкам організацыйна-інструктарскім аддзелам абраны тав. Рубенчык, якога пленум вызваліў ад абавязкаў загадчыка Культпропу.

# „Свабода друку“ ў капіталістычных краінах

У так званых дэмократычных краінах вельмі любяць гаварыць аб „свабодзе друку“. Калі буржуазныя дэмократы і соцыял-фашысты гавораць аб свабодзе друку, яны забываюць дадаць, што гэта ёсьць тая самая свабода, аб якой Анатоль Франс калісьці казаў: „Раўнапраўе ў капіталістычных краінах заключаецца ў тым, што капіталістым і бяспрытульным з беспрацоўнымі аднолькава забараняецца прасіць падачку і начаваць пад адкрытым небам“.

Таксама абстаіць справа і з свабодай друку. Друк формальна свабодны і незалежны, але ўся мэханіка капіталістычнага ладу такая, што гэтая „свабода“ мае зусім вызначаныя, цьвёрдыя рамкі, устаноўленыя ўладаю прамысловых концэрнаў і банкаў. Каб выдаваць газэты ва ўмовах капіталістычнай краіны, патрэбны, як і на вайне, грошы і яшчэ раз грошы. Патрэбны грошы на рэкляму, на каштоўную інформацыю. Трэба мець у сваім распараджэньні сучасны тэхнічны апарат. Пасьля таго, як газэта надрукавана, неабходна з хуткасьцю маланкі даставіць яе ў самыя глухія куткі краіны. Якая карысьць чытачу ад самай парадачнай і незалежнай газэты, калі яе інформацыя бедна, калі пры ёй няма дадатку, выробленага на дарагіх машынах, калі яна нарэшце атрымалася на кватэру падпісчыка, ці паступіла на вулічны продаж хаця-б часам пазьней конкуруючай газэты? Пры такіх умовах газэта ўяўляе сабою самае звычайнае капіталістычнае прадпрыемства. Яна дастаўляе тавар. Гэты тавар павінен быць добраякасным, г. зн. забясьпечваць патрэбы спажыўца і дастаўляцца своечасова.

Вось тыя асноўныя моманты, якімі карыстаюцца прамысловыя трэсты і банкаўскія тузы для таго, каб ператварыць „свабодны“ друк у такога-ж прыслужніка капіталу, у якога ператварыліся ў капіталістычных краінах і другія даволі славутыя заваёвы формальнай дэмократыі.

Гэта бязумоўна ня значыць, што ў капіталістычных краінах няма газэт, якія лічацца органамі адпаведных політычных партый. Такія газэты ў Нямеччыне і ў Англіі яшчэ існуюць. Але буржуазныя політычныя партыі зьяўляюцца політычнымі організацыямі зусім пэўных буржуазных колаў. Яны самі —на ўтрыманьні прамысловых трэстаў і банкаў, а паколькі гэта так, дык іх „незалежнасьць“ толькі ў тым, што яны атрымоўваюць сваё ўтрыманьне (грашовае, а не політычнае) з другіх рук. Гэта ня выключае мажлівасьці існаваньня партыйных органаў, якія знаходзяцца на непасрэдным утрыманьні аднаго пэўнага прамыслоўца ці банкіра: „Дэйтшэ альгемэйнэ Цэйтунг“ была доўгі час проста ўласнасьцю Стынеса, хаця і лічылася органам народнай партыі; „Тэглі-хэр Рунтшаў“ выдавалася на грошы банкіра Літвіна, хаця і лічылася органам Штрэземана—прыяцеля гэтага банкіра; орган цэнтру—„Нямеччына“—належыць буйнаму прамыслоўцу фон-Папэну. І гэтак далей, без канца.

Разьвіцьцё рэклямнай справы прывяло да таго, што газэты самі ператварыліся ў буйна-капіталістычныя прадпрыемствы. Але разьвіцьцё пашло далей: утварыліся газэтныя концэрны—гіганты. У Нямеччыне маецца магутнейшы концэрн Гугенбэрга, які ўладае ня толькі буйнейшым агэнцтвам Тэль-Уніён, некалькімі сталічнымі і буйнымі правінцыйнымі газэтамі, але монопольна забясьпечвае сваім матар'ялам звыш 3000 дробных провінцыйных газэт. З іх 1500 газэт атрымоўваюць ад концэрна Гугенбэрга гатовыя матрыцы, у якія яны ўстаўляюць толькі мясцовую хроніку.

Далей у Нямеччыне існуюць концэрны Ульштэйна і Мосье, якім належыць шэраг газэт у Бэрліне і якім монопольна забясьпечваюць інформацыю шэрагу провінцыйных газэт. У Англіі маюцца концэрны Вібэрбука і Ротэрміра, концэрн провінцыйных газэт Бэры і г. д. Незалежнасьць гэтых концэрнаў ня больш незалежнасьці любога прамысловага ці фінансавага концэрну, яны ніколі не пераступаюць тэй мяжы, за якой знаходзіцца парушэньне інтарэсаў усёй буржуазіі, як клясы. Пагэтаму пры маленшым абвастрэньні соцыяльных конфліктаў увесь гэты друк паўстае на абарону прамыслоўца, банкіра і аграрыя супроць працоўных мас.

Трэба памятаць, што сучасная газэта без рэклямы—пэўна стратнае прадпрыемства. Таму яна—вярней яе прыбытак—залежыць ад цэлага раду буйных капіталістычных прадпрыемстваў. Аб якой незалежнасьці можа быць гутарка, калі на заметку аб бясчынстве, скажам, ва Універмазе Вартгэйма ў Бэрліне, апошні можа адпомсьціць спыненьнем рэклямы. На такую рызыку выдавец самай дэмократычнай газэты ня пойдзе. А ўжо рызыкнуць пасварыцца з буйным банкам, які, папершае, дае яму крэдыты, а падругое, друкуе ў форме дарагога кошту аб'явы справаздачы аб сваёй дзейнасьці, ён наогул ня можа.

Калі газэты гэтага тыпу ўсё ж такі лічацца „політычнымі“ і сур'ёзнымі, дык толькі таму, што яны знаходзяцца як-бы на сталым утрыманьні пэўнай групы капіталістых, так што шырокім масам мэханіка подкупу гэтай прэсы ня відна. Але затое ім відна прадажнасьць так званых інформацыйных газэт.

Тып гэтых газэт больш усяго разьвіты ў Францыі. Гэтыя газэты аб'яднаяліся ў асобную організацыю. Яны прадаюцца на пэўны тэрмін таму, хто лепш заплоціць. Яны прадаюцца асобным прамыслоўцам, банкам і замежным дзяржавам. Царскі ўрад праз свайго агэнта Рафаловіча неаднократна заключаў з гэтай прадажнай бандай дагаворы аб апрацоўцы „грамадзкай думкі“ пры памяшчэньні расійскіх пазык. Цяпер да такіх-жа прыёмаў прыбягаюць урады Польшчы, Румыніі і г. д. Цікава, што „дагавор“ з такімі газэтнымі акуламі заключаецца заўсёды на пэўны тэрмін. Па сканчэньні гэтага тэрміну „інформацыйныя газ... не саромячыся пачынаюць абл... памыямі тых асоб і тыя ўстан... якія яны толькі што ў пра... месяцу хвалілі за аднаведную ...

Сапраўды незалежным друк... капіталістычных краінах зьяўл...ца толькі комуністычны друк... існуе на грошы, якія зьбіра... рабочымі і батракамі. Яму ...ходзіцца перамагаць ня толькі ...ія перашкоды як вечны нед... грошай з прычыны адсутн... рэклям і банкаўскіх крэдытаў. ...прыходзіцца перамагаць нез... вальненьні чытачоў, якія раў... хуткасьць інформацы капі... стычнага друку, з інформа... комуністычных газэт. Тут ком... стычнаму друку прыходзіцца ...рабіць вялікую выхаваўчую р... ту, выкрываючы хлусьлівасьць... ганебнасьць інформацый капі... стычнага друку. Комуністычн... друку прыходзіцца змагацца з ...кімі зьявамі, як недапушчэньне ...продажу ў кіёсках, да пераво... асобых газэтнапаштовых ваго... як гэта было з „Дэйлі Уоркер“... Англіі. Гэтыя прасьледваньні ...муністычнага друку заснаван... на фармальным парушэньні з... ну,—яны служаць найлепшай ...страцыяй таго, што ў капіталіс... ных краінах разумеюць пад „с... бодай друку“. Ня прыходз... ўжо гаварыць аб судовых ...сьледваньнях комуністычных ...ганаў і журналістых пад са... ...розпастайнымі прадлогамі.

**У. УЛАСА...**

Пролетарскі друк—лепшая зброя комуністычнай партыі ў барацьбе за соцыялізм

# ...юро ЦК ЛКСМБ прызнала палітычную лінію „Ч. З.“ правільнай

...згортваючы бальшавіцкую самакрытыку, організоўваючы масы комсамольцаў рабоча-батрацкай, бядняцкай і серадняцкай ...ладзі на выкананьне генэральных задач нашай партыі „Чырвоная Зьмена“ яшчэ мацней будзе стаяць на аванпостах клясавай барацьбы, яшчэ больш будзе гартаваць клясавую баяздольнасьць комсамольскай організацыі

## Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ па дакладу „Чырвонай Зьмены“

...Заслухаўшы даклад „Чырво... Зьмены“ бюро ЦК ЛКСМБ адзна... што газэта за апошні час ...на прасунулася наперад як па ...му зьместу, так і па свайму ...рмленьню. У баявым парадку ...а на правільны шлях вы...ўленьня меўшых месца пра...аў у комсамоле Беларусі, а ...сама і ў самой газэце.

...Больш рашуча стала на шлях ...лярызацыі лініі партыі, змага...ся з усялякага роду праяў...ямі правага ўхілу на прак...ы, концэнтруючы на ім галоўны ..., і з „левымі“ загібамі і пры...цтвам да іх.

...нацыянальна-культурным бу...ніцтве правільна орыентуе орга...цыю на барацьбу з праявамі ...нал-опортунізму, нац.-дэмо...ызму і шовінізму ўсіх колераў, ...ліва шырока разгарнуўшы га... работу ў час правядзеньня ...месячніку беларускай і нац... ...ускай пролетарскай культуры.

... Разгортваючы на сваіх ста...ах базьлітасную бальшавіцкую ...рытыку, „не зважаючы на асо...“, дапамагаючы шырокай ком...ольскай масе ў пашырэньні і ...ортваньні ў комсамоле кры...кі і самакрытыкі, як асноўнага ...у перабудовы і палепшаньня ... работы ЛКСМБ, „Чырвоная ...на“ значна дапамагла ком...ольскай організацыі ў выкрыцьці ...нішчэньні меўшых месца пра...аў у асобных зьвеньнях ком...олу, выхоўваючы шырокія масы ...самолу і беспартыйнай працоў... моладзі ў духу няпрымірымай ...ацьбы за правядзеньне ленінскай ... нашай партыі.

...Выходзячы з гэтага, бюро ЦК ...іць політычную лінію газэты ...вільнай.

... далейшым бюро ЦК ЛКСМБ ...пануе:

1. Ва ўпартай, энэргічнай і не...мірымай барацьбе за генэраль... лінію нашай партыі, концэн...ваць галоўны агонь па праявах ...нага опортунізму, які прадстаў... галоўную небясьпеку на даным ... разьвіцьця, не паслабляючы ...ацьбы з „левай“ фразай і пры...нцтвам да іх. На конкрэтных ...кладах соцыялістычнага будаў..., клясавай барацьбы—выхоў... масы ў духу ленінскай лініі ...ртыі, рашуча разгортваючы ба...ацьбу з усімі адхіленьнямі ад ге...льнай лініі партыі і ў комса...ольскай організацыі як у пытань... саюзнага будаўніцтва, так і ў ...дзённай рабоце.

2. Больш энэргічна і ўпарта ...весьці сыстэматычную работу па ...рацьбе з усялякага роду адхі...ньнямі ад ленінскай лініі партыі ... нацыянальным пытаньні, нанося... галоўны ўдар па беларускаму ...-дэмократызму, рашуча змага...ся з шовінізмамі розных коле...

...„Чырвонай Зьмене“ шырока раз...нуць работу па барацьбе з пра...мі недаацэнкі беларусізацыі асоб...ымі зьвеньнямі комсамолу, рашуча ...ючы па праявах вялікадзяржаў... шовінізму, выкрываючы ўвесь ... клясавы характар.

...Непаслабляючы, а ўсямер... разгортваючы работу на концэн...цыі і мобілізацыі ўвагі мас ком...молу і беспартыйнай рабочай мо...дзі на пытаньнях нацыянальна-...культурнага будаўніцтва, „Чырво... Зьмена“ павінна ўсямерна да...агчы організацыі ў популярыза...і важнейшых конкрэтных пы...ньняў нацыянальна-культурнага ...будаўніцтва, концэнтруючы ўвагу на прыцягненьні мас комсамолу і беспартыйнай працоўнай моладзі да актыўнай барацьбы на ідэолёгічным фронце за чыстату ленінскай лініі бальшавіцкай партыі. У прыватнасьці разгарнуць шырокую масавую работу да ўсебеларускага політ-бою, дапамагаючы комсамольскай масе ў практычнай яе рабоце.

3. ЦК ЛКСМБ адзначае, што ня гледзячы на наяўнасьць зрухаў у пытаньнях популярызацыі саюзнага будаўніцтва, гэтая работа ўсё-ж яшчэ не ў поўнай меры адпавядае тым задачам, якія ўскладзены на комсамол у сувязі з паваротам саюзу тварам да гаспадарчага будаўніцтва. Слаба пастаўлен абмен вопытам работы, слаба ўзьнімаецца шэраг асобных пытаньняў практычнай перабудовы работы ячэек у сувязі з важнейшымі політычнымі задачамі саюзу. Далейшая работа павінна быць накіравана на шырокі абмен вопытам, прапрацоўку і абгаварэньне асобных пытаньняў перабудовы работы ячэек, шырокае выкрыцьцё конкрэтных носьбітаў зла ў пытаньнях перабудовы ўсёй работы саюзу, разгортваючы няпрымірымую бальшавіцкую крытыку і самакрытыку ўсіх пытаньняў унутрысаюзнага будаўніцтва.

4. У сувязі з важнейшымі чарговымі політычнымі задачамі, як у горадзе—па лініі барацьбы за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну, так і ў вёсцы—барацьба за суцэльную колектывізацыю і на аснове яе ліквідацыя кулацтва як клясы,—весьці барацьбу за організацыю працы ў колгасах, за мобілізацыю мас рабоча-батрацкай, бядняцкай і серадняцкай моладзі на іх выкананьне.

5. „Чырвонай Зьмене“ разгарнуць шырокую работу па асьвятленьню соцыялістычнага спаборніцтва, мобілізуючы масы вакол яго, узьнімаючы ініцыятыву мас, організуючы яе вакол конкрэтных пытаньняў соцыялістычнага будаўніцтва, рашуча змагаючыся з усім тым, што перашкаджае нашай рабоце, выкрываючы конкрэтных носьбітаў зла.

Газэта павінна больш популярна і сыстэматычна паказваць організацыі вузоры комуністычнай працы на вытворчасьці і конкрэтныя дасягненьні па соцыялістычнаму будаўніцтву, выхоўваючы на конкрэтных прыкладах шырокія масы працоўнай моладзі.

6. ЦК ЛКСМБ лічыць, што „Чырвоная Зьмена“ павінна ўзмацніць сваю ролю па дапамозе і кіраўніцтву „Лёгкай Кавалерыі“, палепшыўшы зьмест лісткоў „Л. К.“, зьвярнуўшы ўвагу ня толькі на асьвятленьне асобных фактаў работы, але і на ўзмацненьне кіруючага матар'ялу „Л. К.“.

7. Адзначаючы слабую работу з юнкорамі і чытачамі і наогул масавую работу ў організацыі вакол газэты, ЦК ЛКСМБ высоўвае на бліжэйшы адцінак часу наступныя задачы:

а) узмацніць і сыстэматычна кіраваць работай юнкораў шляхам распрацоўкі і дачы тэматычных заданьняў;

б) пашырыць апраўдаўшы сябе вопыт юнкораўскіх брыгад, перанёсшы гэтую форму работы з юнкорамі на ўсе буйныя прадпрыемствы і на колгасы;

г) узмацніць кіраўніцтва ячэйковымі ўпаўнаважанымі па „Чырвонай Зьмене“, завастрыўшы ўвагу ў іх рабоце ня толькі на тыражнай рабоце, але на пашырэньні масава выхаваўчай работы з газэтай;

д) рэдакцыі прыняць усе захады да поўнага выкарыстаньня юнкораўскага матар'ялу і на хуткае рэагаваньне па зьмяшчаемых допісах;

е) „Чырвонай Зьмене“ ўзмацніць дапамогу і сувязь з іншымі комсамольскімі і піонэрскімі газэтамі Беларусі і комсамольскімі старонкамі шматтыражак даючы пэрыодычныя агляды газэт, усямерна дапамагаючы ім у рабоце.

8. Адзначаючы вялікую ролю „Чырвонай Зьмены“ у комсамольскім руху Беларусі ў сувязі з дзевяцігадовым юбілеем яе існаваньня, ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе організацыі комсамолу АК, РК і ячэйкі шырока разгарнуць работу па прасоўваньню „Чырвонай Зьмены“ ў гушчы працоўнай моладзі, да разгортваньня шырокай масавай работы вакол газэты.

З мэтай ажыцьцяўленьня і популярызацыі задач і работы газэты лічыць неабходным з 1-га мая па 1-ае чэрвеня правесьці месячнік „Чырвонай Зьмены“ ў організацыі.

Даручыць аддзелу прапаганды ЦК ЛКСМБ сумесна з рэдколегіяй „Чырвонай Зьмены“ скласьці падрабязны плян месячніку, сконцэнтраваўшы ўвагу арганізацыі на выкананьне важнейшых політычных задач, якія стаяць перад комсамолам і яго цэнтральным орг. „Чырвонай Зьменай“.

9. Увьняць пытаньне перад ЦК КП(б)Б аб павялічэньні фармату газэты.

„Чырвонай Зьмене“ шырока разгарнуць на сваіх старонках популярызацыю 5-гадовага пляну гаспадаркі і культуры БССР,—асьвятляючы пытаньні адукацыі і быту моладзі. Разгарнуць шырокае асьвятленьне прапаноў ЦК ЛКСМБ па гэтаму пытаньню. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўзьняцьце шэрагу прынцыповых пытаньняў, зьвязаных з адукацыяй і бытам рабочай і колгаснай моладзі.

Адзначаючы зусім слабое асьвятленьне ў газэце пытаньняў піонэрскага руху, бюро ЦК ЛКСМБ лічыць неабходным узмацніць асьвятленьне жыцьця піонэрорганізацыі і кіраўніцтва комсамолам над піонэрорганізацыяй, дапамагаючы гэтым комсамолу палепшыць сваё кіраўніцтва над піонэрамі.

### Шматтыражкі ў барацьбе за прамфінплян

# Баявыя сыгнальшчыкі будоўлі

„... Мы патрабуем ад газэты барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну у па ўсіх правілах гаспадарча-політычнай „тактыкі і стратэгіі...“

„... Шматтыражкі часта сьлізгаюцца па паверхні пытаньняў, ня ўмеючы зьбіраць і ставіць вядучыя зьвеньневыя пытаньні...“

(З дакладу тав. Курціка на ўсебеларускай нарадзе рэдактароў фабрычна-заводзкіх газэт).

Пасьпяховае выкананьне прамфінпляну магчыма толькі пры даведзеньні прамфінпляну да кожнага асобнага рабочага, толькі пры ўмовах, калі кожны рабочы будзе адчуваць сябе непасрэдным удзельнікам у барацьбе за прамфінплян.

Вялікую ролю ў гэтай справе, справе даведзеньня прамфінпляну да асобнага варштату, адыгрывае заводзкая шматтыражка. Шматтыражка—дзецішча пашых насьценных газэт—цесна ўвязана з усёй вытворчасьцю, яе праца накіравана на організацыю ўвагі і энэргіі рабочых для пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, на зьнішчэньне недахопаў, якія пагражаюць зрывам агульнага пляну вялікіх работ.

Шматтыражка „Голас Швэйніка“ —орган рабочых і служачых швэйнай фабрыкі „Комінтэрн“ вядзе ўпартую барацьбу з усімі праявамі зрываў выкананьня прамфінпляну. Пад загалоўкам „калёным уцюгам“ газэта рэзкай рабкораўскай заметкай паказвае сапраўдны твар лжэударнікаў. Маленькімі заметкамі газэта ўзьнімае цэлы шэраг („дробных“) фактаў, паказваючы на неабходнасьць прыняцьця конкрэтных захадаў для выпраўленьня гэтых недахопаў.

На другой старонцы тэй-жа газэты „шапка“ рэжа вочы:

„Павядзем рашучую барацьбу з дробнымі недахопамі, якія могуць прывесьці да буйных прарываў“. У гэтым аддзеле газэта імкнецца выявіць дробныя недахопы фабрыкі, бо гэтыя „дробязі“, могуць прывесьці да вялікіх прарываў.

Так заводзкая шматтыражка разам з рабочай масай змагаецца за пасьпяховае выкананьне прамфінпляну.

Газэта ня толькі констатуе недахопы і мобілізуе ўвагу на зьнішчэньне іх, але і вядзе працу па выяўленьню ўдалага вопыту, запальвае энтузіязм пасазам добрых дасягненьняў у справе лепшай організацыі працы.

Газэта „Полесдруку“—„Ротацыя“ у першамайскім нумары дае баявы першамайскі лёзунг.

**„Першае мая—баявы агляд рэволюцыйных сіл сусьветнага пролетарыяту. У гэты дзень даем абяцаньне ліквідаваць прарывы, выканаць прамфінплян да 16 партзьезду“.** Пад гэтым лёзунгам, як пад штандарам, газэта будзе ўпарта змагацца за выкананьне прамфінпляну і гэта будзе лепшым падарункам да 16 партзьезду. Газэта завастрае ўвагу на сучасным становішчы выкананьня прамфінпляну на вытворчасьці і задачах, якія ў зьвязку з гэтым паўстаюць.


**„Што трэба зрабіць, каб ліквідаваць прарыў?“**—пад такім лёзунгам газэта рабочых гарбарні „Бальшавік“—„Рабочае Вока“ зьмяшчае артыкул, у якім высоўвае цэлы шэраг прапаноў, ажыцьцяўленьне якіх будзе штурхачом у справе ліквідацыі прарываў. У гэтым-жа нумары „Рабочае Вока“ зьмяшчае заметку: **„Чырвонаштандартны Бальшавік“—усё яшчэ адстае.**

У свой час газэта змагалася за ордэн чырвонага сьцягу і мобілізоўвала працоўныя масы на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы. Газэце і на далейшы час неабходна прыкласьці патугі, каб прарывы, якія маюцца ў гарбарні, былі зьнішчаны.

У сучасны момант у Беларусі выдаецца звыш 20 шматтыражак. Газэты зьяўляюцца сапраўднымі організатарамі мас працоўных, сапраўднымі сыгнальшчыкамі ў вялікай працы.

Трэба адзначыць як недахоп, слабую беларусізацыю газэт. Большасьць з іх выдаецца на расійскай мове. У гэтым напрамку павінен быць рашучы пералом.

Твар комсамольскай організацыі ў шматтыражках не выяўляецца. Апрача асобных комсамольскіх куткоў, у некаторых газэтах аб удзеле моладзі ў вытворчасьці, аб яе організацыйнай дзейнасьці мы знаходзім слабы адбітак.



НА ЗДЫМКУ: шматтыражкі, якія выдаюцца прадпрыемствамі і колгасамі Беларусі.

Нашай комсамольскай організацыі неабходна будзе зьвярнуць больш увагі на гэты вучастак, каб дзецішча Кастрычніка — шматтыражныя газэты—змаглі сапраўды справіцца з пастаўленымі перад імі вялікімі задачамі.

Сёньня, у дзень друку,—непасрэдным прадстаўнікам бальшавіцкага друку на вытворчасьці,—шматтыражным газэтам неабходна праверыць сваю працу з тым, каб выжыць рэшткі насьценгазэтаўшчыны, з тым, каб сапраўды прыстасаваць сваю працу для далейшых боеў і перамог разам з усёй працоўнай масай і ў перадзе яе.

А. Глезер.

# БОЛЬШ УВАГІ ЮНАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Юнсэктар БДВ організаваны ня так даўно. За час свайго існаваньня ён зрабіў некаторы зрух у выданьні юнацкай пролетарскай літаратуры і популярызацыі яе сярод комсамольцаў, піонэраў і беспартыйнай працоўнай моладзі. У параўнаньні з мінулым выданьне беларускай юнацкай літаратуры на Беларусі значна павялічылася. Але ўсё-ж паказчыкі выданьня юнацкіх кніжок складаюць зусім нязначную колькасьць літаратуры, напісанай аўтарамі, згрупаванымі навакол юнацкага сэктару.

Выкананьне пляну юнсэктару праходзіць нездавальняюча, дзякуючы зусім малой колькасьці кадраў, якія пішуць юнацкую літаратуру.

НКА, комсамол і БДВ зусім нічога не зрабілі дзеля ўтварэньня навакол юнацкага сэктару моцнай групы марксыстых, мэтодыстых, поэтаў і пісьменьнікаў, таксама комсамольска-піонэрскіх працаўнікоў і школьных работнікаў, каб можна было пасьпяхова выконваць свае плянавыя меркаваньні. **Пытаньнем кадраў для юнацкай літаратуры трэба ў самым найхутчэйшым часе заняцца,** бо такое становішча будзе і надалей тармазіць выданьні баявой літаратуры.

Пры юнсэктары створаны савет, які займаецца толькі разглядам, падборкаю і рэдагаваньнем юнацкай літаратуры, але не паставіў перад сабою баявой задачы найбольшага прыцягненьня ў юнсэктар лепшых сіл пісьменьнікаў марксыстых і мэтодыстых.

Больш таго, навакол выданай юнацкай літаратуры не ствараецца адпаведная думка, не вядзецца работа па популярызацыі літаратуры сярод працоўнай моладзі. Мэтадком НКА у гэтым напрамку нічога не зрабіў.

Спачатку была пастанова мэтадкому НКА аб організацыі навуковага інстытуту па вывучэньню дзіцячай літаратуры, але гэта пастанова засталася толькі на паперы. Мэтадком амаль ня кіруе юнсэктарам.

Абвешчаны конкурс на лепшую юнацкую кніжку яшчэ ня даў належных вынікаў. Прысланыя каля 20 рукапісаў па сваёй якасьці дрэнныя.

Навакол конкурсу ня створана грамадзкае думкі, ня прыцягнуты лепшыя сілы для ўдзелу ў ім.

Комсамольскія організацыі надзвычайна слаба дапамагаюць юнсэктару ў стварэньні баявой пролетарскай юнацкай літаратуры. Ды і сам сэктар слаба популярызуе свае асноўныя задачы ў справе выданьня юнацкай літаратуры.

Найбольшыя ненармальнасьці маюцца ў галіне распаўсюджваньня літаратуры.

Выданыя кніжкі несваечасова даходзяць да шырокіх колаў моладзі, бо няма плянавасьці.

Заўважваецца між некаторымі ўстановамі кніжная „конкурэнцыя“, якая шкодзіць, а часамі і зрывае пасьпяховае прасоўваньне таго ці іншага выданьня.

Уся продукцыя БДВ распаўсюджваецца цяпер праз Белкоопсаюз. На сёньнешні дзень на базах БДВ няма літаратуры. Уся яна накіравана ў спажывецкія коопэрацыі, дзе ў большасьці ляжыць бяз руху.

Белкоопсаюз лепш організоўвае распаўсюджваньне селядцоў, чымся кніжок.

У дзень друку неабходна організаваць баявы паход „лёгкай кавалерыі“ на кніжныя паліцы коопэрацыйных аб'яднаньняў, складаў і кіёскаў, праверыўшы сапраўдны стан распаўсюджваньня пролетарскага друку. Патрэбна ліквідаваць галавацкапскія і бюракратычныя перашкоды плянавага забясьпечаньня прадпрыемстваў, колгасаў, савгасаў і вёсак пролетарскай літаратурай.

...Толькі некалькі месяцаў таму назад па ініцыятыве комсамолу было ўзьнята пытаньне аб адчыненьні ў Менску на месцы віннага магазыну юнацкага колектару. Адчыненьне колектару мелася адбыцца 20 красавіка. Але..., і па сёньняшні дзень колектар не адчынен. Праўленьне БДВ бязьдзейнічае і фактычна зрывае організацыю колектару, вядучы пакуль што меркаваньні, дапасаваньні і ўзгадненьні...

Нельга не адзначыць і таго факту, што само праўленьне БДВ не надае юнацкаму сэктару дастатковай увагі.

Выданьне некаторых юнацкіх кніжак «адкладаюць на другі плян».

Слаба організавана выданьне кніжак па ўнутрысаюзных комсамольскіх пытаньнях.

Юнсэктару трэба тэрмінова зьвязацца з мясцовымі комсамольскімі і піонэрскімі організацыямі з мэтай асьвятленьня вопыту іх работы і організацыі распаўсюджаньня выданай юнацкай кніжкі.

Нясупынна весьці работу па згуртаваньню кадраў юнацкай літаратуры.

Я. К.



Занятні чырвонаармейцаў.

# Аб мастацкіх праглядах

Да кожнага рэволюцыйнага сьвята культаддзелам ЦСПСБ, галоўлітбелам, пасрэдмастацтвам, прадстаўнікамі з рабочых клюбаў робіцца грамадзкі прагляд програм як артыстых гастралёраў з іншых гарадоў, таксама і мясцовых артыстых. Самы факт вельмі пажаданы і карысны, бо толькі такім чынам можна абараніць сцэну рабочага клюбу ад аджываючай музычнай і эстраднай пашлясьціны, толькі такім чынам можна популярызаваць патрэбнае нам мастацтва, блізкае нам па свайму зьместу.

Але справа, бачыце, ў тым, што кіраўнікі з ЦСПСБ і галоўлітбел у праводзяць гэта ў жыцьцё не палюдзку. На кожным такім праглядзе праходзяць дзесяткі сьпевакоў, музыкаў, а ў камісіі, якая фактычна вырашае прыгоднасьць альбо няпрыгоднасьць артыстага, няма ніводнага чалавека музыкі, які-б разьбіраўся дакладна ў музыцы. Звычайна так пачынае аратар-член камісіі: «У музыцы—то я, прызнацца... профан, але словы нішто, ведаеце—нішто... можна прапусьціць... хай сьпявае на здароўе!

Калі вы, таварышы, слаба разьбіраецеся ў музыцы—тут нічога дзіўнага няма, але дзіка тое, што вы ніколі не запрашаеце ў камісію музыку, які-б мог ацаніць варт[illegible] таго ці іншага нумару, а то з добрым тэкстам пралазяць [illegible]бочую сцэну такія пэрлы, як: [illegible]шен звон бубенцов издалека“, [illegible]рогой длинною“, „Кирпичики“, [illegible] Мойке, на Фонтанке“ і інш. [illegible]стыя, [illegible] гэты [illegible] вядуць [illegible] сабо[illegible];

— Та[illegible] ікс, ты што [illegible] па сьпяваеш?

— Я? Гм... Што за пыт[illegible] Вось ноты ўчора дастаў, [illegible] будзь...

— Дык ты-ж гэтых рэча[illegible] ведаеш.

— Эт ты, зялёны... як [illegible] „прараву“ і абы словы, а ў [illegible]цы яны, брат, а ні вуха, ні [illegible]

— Няўжо?? Вось дык камі[illegible]

— Ха-ха-ха-ха!!!

# Апавяшчэньне

Сёньня 5-V—30 г., а 7 га[illegible] ўвечары, у памяшканьні Камасьветы адбудзецца сход [illegible] праф. і камсамольскага акт[illegible] прысьвечаны дню друку.

Білеты па ячэйкам і Фабзаў[illegible]комам.

АК КП(б)Б, АК КСМБ, ЦСПС[illegible]

Адказны рэдактар—Рэдкалегі[illegible]

# Бальшавіцкае дзецішча „Чырвонай Зьмены“

## —шматтыражная газэта „Трактар“

Адзначаючы сёньня 9-гадовы юбілей баявога органу комсамолу Беларусі „Чырвонай Зьмены“, пройдзены ёю 9-гадовы шлях творчай работы, барацьбы на барыкадах соцыялістычнай будовы, бязьлітаснай барацьбы з хістаньнямі ад ленінскай лініі партыі, за правільнае ажыцьцяўленьне яе на ўсіх рыштаваньнях грандыёзнай соцыялістычнай будоўлі, мы павінны пару слоў удзяліць яе дзецішчу, пладу яе комсамольскай ініцыятывы —шматтыражнай газэце „Трактар“ Койданаўшчыны.

Здавалася-б, што шматтыражка „Трактар“, зьяўляючыся „крупіцай“ барыкадных будняў «Чырвонай Зьмены», не заслугоўвае таго, каб ёй адводзіць спэцыяльны куток на балонках „Чырвонай Зьмены“ ў дзень дзевяцігодзьдзя. Але паколькі гэта „крупіца“ ня можа не разглядацца інакш як праз прызму барацьбы «Чырвонай Зьмены» за генэральную лінію партыі, мы павінны адзначыць, што да дня 9-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“ мы выпусьцілі новага „салдата“—змагара за генэральную лінію партыі ў агульных шэрагах арміі пролетарскага друку.

Зараз, калі рабочая кляса ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства, пад ленінскім кіраўніцтвам комуністычнае партыі вядзе самаадданую, з нябачанымі ў гісторыі томпамі барацьбу за пабудову соцыялізму, барацьбу, якая зьвязана і ня можа быць ня зьвязана з жорсткай контратакай клясавага ворага, газэта „Трактар“—дзецішча „Чырвонай Зьмены“—павінна ацэньвацца, як новы танк на фронт колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як кляcы, на фронт бязьлітаснай барацьбы з скажэньнямі партыйнай лініі, за правільнае яе ажыцьцяўленьне на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

ТРАКТАР

24 красавіка 1930 г. ••• № 3

На хаду выпраўляюць прарывы ў правядзеньні севу

Пачаліся палявыя работы

35 сталёвых коняй на палёх вясеньняй

Колгас уздоўжваецца

Іменна так, толькі так, толькі праз гэтую прызму мы разглядаем выданьне, у той-жа час і падарунак 9-гадоваму юбілею „Чырвонай Зьмены“, газэты „Трактар“.

З першых сваіх нумароў „Трактар“ бальшавіцкімі лемехамі, усім размахам сваіх старонак, абрушыўся ў атаку за бальшавіцкае наступленьне на фронце колектывізацыі, за правільнае ажыцьцяўленьне ў гэтым наступленьні лініі партыі, нарэшце,—за бальшавіцкае правядзеньне вясеньняга севу, як рашаючага фактару ў далейшым пасьпяховым наступленьні, за рашучую барацьбу з панікёрамі, ултэрпрышыбеевымі і галавацяпамі.

Гэтым насычаны першыя нумары газэты «Трактар». Праўда, яшчэ ня ўсе вінты ў „Трактары“ шчыльна завінчаны. Праўда, яшчэ не на ўсіх барознах „Трактар“ да дна наносіць глыбокія паражэньні адмоўным дэфэктам і гэты—другі бок, які знаходзіцца ў супярэчнасьці з першым, але ня можа засланіць жыцьця і барацьбы газэты «Трактар“, аб якім мы гаворым сёньня.

Зараз „Трактару“ можна пажадаць толькі адно, каб усе свае маладыя бальшавіцкія ўдары ён трапна накіроўваў, пападаў і паражаў самыя галоўныя сілы ворага, каб ён сваім агнём самакрытыкі нанасіў зьнішчаючыя ўдары па тых, хто імкнецца атакаваць справа і „лева“ ленінскую лінію партыі, каб ён заўсёды стаяў на адзіна правільным ленінскім шляху. Толькі гэтага, адзначаючы 9-годзьдзе „Чырвонай Зьмены“, мы можам пажадаць яе дзецішчу—шматтыражнай друкаванай газэце Койданаўскага раёну—„Трактар“.

М.

# Выклік зрабілі, але... аб рабоце забылі

У Аршанскай аб'яднанай профшколе ўдарныя брыгады да гэтага часу не змаглі разгарнуць належным чынам падрыхтоўкі да гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва, яны ў большасьці працуюць самацёкам, бо кіраўніцтва з боку комсамольскіх колектываў да гэтых пор зусім слабае, а таксама і ня ўсе комсамольцы яшчэ ўцягнуты ў брыгады.

Галоўнай перашкодай у працы ўдарных брыгад зьяўляецца тое, што майстры і некаторыя настаўнікі ў брыгадах дрэнна адносяцца да соцыялістычнага спаборніцтва, нічым не дапамагаючы яго правядзеньню,

Аршанская профшкола выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва Клімаўскую профтэхшколу і на працягу ўсяго часу ніякай працы па абмену вопытам і выкананьню пунктаў дагавору не правяла.

Аршанскі.

# Да ведама студэнтаў завочнікаў

Дэканат менскага завочнага рабфаку даводзіць да ведама студэнтаў, што з 20 па 25 мая г. г. адбудзецца праверка ведаў студэнтаў і конфэрэнцыя з акадэмічна адсталымі таварышамі.

Для атрыманьня літара з 50-проц. скідкай па чыгунцы ўсім студэнтам да вызначанага тэрміну неабходна хутка паведаміць рабфак аб прыезьдзе на конфэрэнцыю альбо для праверкі ведаў. Адначасова паведаміць назву чыгуначнай станцыі, з якой патрэбна выяжджаць, палустанку і разьезду пісаць ня трэба.

Нам. дэкана рабфаку ЯКАЎЛЕЎ.

5 МАЯ Ў ДОМЕ ПІСЬМЕНЬНІКА АДБУДЗЕЦЦА

# ВЯЛІКІ ВЕЧАР

прысьвечаны дню друку з наступнай праграмай

1. ДАКЛАД „пісьменьнікі і друкаванае слова“
2. КОНЦЭРТ
СЬПЕВЫ, СКОКІ, БАЛЕТ, МАСТАЦКАЕ ЧЫТАНЬНЕ, МУЗЫКА І г. д.
3. У парадку самадзейнасьці—гульні, чытка новых твораў, гумар.

Запрашаюцца пісьменьнікі і іх сем'і, для якіх уваход вольны, іншыя па запрашальных білетах, якія можна атрымаць у загадчыка Дому Пісьменьніка.

ПАЧАТАК А 8-й ГАДЗІНЕ.

Праўленьне Дому Пісьменьніка.

МенАК ЛКСМБ у гэтым годзе адчыняе **Дом Адпачынку,** які будзе існаваць з 15-га мая да 1-га верасьня г.г.

УСЕ ЭКАНОМ-ПРАЦАЎНІКІ ПАВІННЫ ЗДАЦЬ СЬПІСЫ,

жадаючых ехаць у Дом Адпачынку да 8-га мая, бо 400 месц ужо занята. У выпадку несваечасовай падачы сьпісаў яны застануцца бяз месц у Доме Адпачынку.

Сьпісы прымаюцца ад 9-ці да 4-х гадз. дню штодзённа і ад 6-ці да 7 з пал. увечары.

Заг. Мас.-эканом. аддз. Мен. АК ЛКСМБ ГОЛЬДБЭРГ

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599